Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»

# Вестник БарГУ

**Ежеквартальный научно-практический журнал**

Издаётся с марта 2013 г. Выпуск 5, декабрь, 2017. Серия «Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки»

*Учредитель:* учреждение образования «Барановичский государственный университет».

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ**

*Главный редактор журнала* Кочурко Василий Иванович, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, академик Белорусской инженерной академии, академик Международной академии технического образования, академик Международной академии наук педагогического образования, академик Академии экономических наук Украины, Заслуженный работник образования Республики Беларусь, ректор учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

*Заместитель главного редактора журнала* Климук Владимир Владимирович, кандидат экономических наук, доцент, проректор по научной работе учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

**РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ СЕРИИ**

**Главный редактор серии**

Познякевич Виктория Николаевна, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой бухгалтерского учёта, анализа, аудита и статистики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

**Ответственный секретарь серии**

Познякевич Виктория Николаевна, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой бухгалтерского учёта, анализа, аудита и статистики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

**Редактор текстов на английском языке**

Пинюта Ирина Вячеславовна, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры профессиональной иноязычной подготовки учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Андрияшко Марина Васильевна *(ответственный за направление «Юридические науки»)*, кандидат юридических наук, доцент, заведующий кафедрой общеправовых дисциплин и государственного управления учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Демидович Анатолий Викторович *(ответственный за направление «Исторические науки и археология»)*, кандидат исторических наук, заведующий кафедрой социально-гуманитарных дисциплин учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Короб Александр Николаевич *(ответственный за направление «Экономические науки»)*, кандидат экономических наук, заведующий кафедрой теоретической и прикладной экономики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Безуглая Виктория Александровна, кандидат экономических наук, доцент, декан факультета экономики и права учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Василевич Григорий Алексеевич, Заслуженный юрист Республики Беларусь, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой конституционного права Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Вишневский Алексей Фёдорович, доктор исторических наук, профессор кафедры теории и истории государства и права учреждения образования «Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь» (Минск, Республика Беларусь).

Гурский Василий Леонидович, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономики частного учреждения образования «БИП — Институт правоведения» (Минск, Республика Беларусь).

Демичев Дмитрий Михайлович, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой теории и истории права учреждения образования «Белорусский государственный экономический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Житкевич Галина Яковлевна, кандидат экономических наук, доцент, доцент кафедры бухгалтерского учёта, анализа, аудита и статистики учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Репозиторий БарГУ

Захарченко Людмила Анатольевна, кандидат экономических наук, доцент, доцент кафедры экономической теории учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Зорин Роман Георгиевич, кандидат юридических наук, доцент, заведующий кафедрой гражданских и уголовно-правовых дисциплин учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Карев Дмитрий Владимирович, доктор исторических наук, профессор, профессор кафедры дизайна, директор Центра социально-экономических и междисциплинарных исследований диаспор и зарубежного белорусоведения учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» (Гродно, Республика Беларусь).

Касич Алла Александровна, доктор экономических наук, профессор Кременчугского национального университета имени М. Остроградского (Кременчуг, Украина).

Ключко Римма Николаевна, кандидат юридических наук, доцент, заведующий кафедрой уголовного права, уголовного процесса и криминалистики учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» (Гродно, Республика Беларусь).

Козлова Зоя Николаевна, кандидат исторических наук, доцент, доцент кафедры теории и практики физической культуры учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Колядко Иван Николаевич, кандидат юридических наук, профессор, профессор кафедры гражданского процесса и трудового права Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Куган Светлана Фёдоровна, кандидат экономических наук, доцент, заместитель декана экономического факультета учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Кузьменко Владимир Иванович, доктор исторических наук, профессор, заведующий Центром истории постиндустриального общества Государственного научного учреждения «Институт истории Национальной академии наук Беларуси» (Минск, Республика Беларусь).

Литвинский Александр Владимирович, кандидат исторических наук, доцент кафедры социально-гуманитарных дисциплин учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Лосев Владимир Владимирович, кандидат юридических наук, доцент, заместитель директора Государственного учреждения «Научно-практический центр проблем укрепления законности и правопорядка Генеральной прокуратуры Республики Беларусь» (Минск, Республика Беларусь).

Лютый Анатолий Михайлович, доктор исторических наук, профессор, профессор кафедры истории Беларуси и славянских народов учреждения образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка» (Минск, Республика Беларусь).

Манкевич Ирина Петровна, кандидат юридических наук, доцент, доцент кафедры гражданско-правовых дисциплин учреждения образования «Белорусский государственный экономический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Матвеюк Ярослав Николаевич, кандидат юридических наук, уполномоченный ректора Университета в Белостоке по делам сотрудничества с университетами Восточной Европы (Белосток, Польша).

Медведева Гульнара Борангалиевна, кандидат экономических наук, доцент, доцент кафедры экономической теории учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Момот Татьяна Валерьевна, доктор экономических наук, профессор Харьковской национальной академии городского хозяйства (Харьков, Украина).

Нечухрин Александр Николаевич, доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой всеобщей и славянской истории учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» (Гродно, Республика Беларусь).

Омельянюк Александр Михайлович, кандидат экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономической теории учреждения образования «Брестский государственный технический университет» (Брест, Республика Беларусь).

Остроглял Александр Васильевич, кандидат юридических наук, доцент, проректор по научной работе частного высшего учебного заведения «Ивано-Франковский университет права имени Короля Даниила Галицкого» (Ивано-Франковск, Украина).

Солодовников Сергей Юрьевич, доктор экономических наук, доцент, заведующий кафедрой экономики и права Белорусского национального технического университета (Минск, Республика Беларусь).

Сулайманова Назгуль Назарбековна, доктор юридических наук, доцент, заведующий кафедрой уголовного права и криминологии Государственного образовательного учреждения высшего профессионального образования «Кыргызско-Российский Славянский университет» (Бишкек, Кыргызская Республика).

Таранова Татьяна Сергеевна, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой гражданско-правовых дисциплин учреждения образования «Белорусский государственный экономический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Функ Ян Иосифович, доктор юридических наук, профессор, профессор кафедры финансового права и правового регулирования хозяйственной деятельности Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Черняк Юрий Вячеславович, кандидат исторических наук, доцент кафедры общеправовых дисциплин и государственного управления учреждения образования «Барановичский государственный университет» (Барановичи, Республика Беларусь).

Шалаев Владимир Павлович, доктор философских наук, профессор, декан факультета социальных технологий Федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего профессионального образования «Поволжский государственный технологический университет» (Йошкар-Ола, Республика Марий Эл, Российская Федерация).

Шабанов Вячеслав Борисович, доктор юридических наук, профессор, заведующий кафедрой криминалистики Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Шевлюков Александр Петрович, доктор экономических наук, профессор, заведующий кафедрой бухгалтерского учёта и финансового менеджмента в отраслях народного хозяйства учреждения образования «Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации» (Гомель, Республика Беларусь).

Юркевич Николай Григорьевич, доктор юридических наук, профессор, профессор кафедры гражданского процесса и трудового права Белорусского государственного университета (Минск, Республика Беларусь).

Яковчик Николай Степанович, доктор экономических наук, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, директор Института повышения квалификации и переподготовки кадров АПК учреждения образования «Белорусский государственный аграрный технический университет» (Минск, Республика Беларусь).

Репозиторий БарГУ

*Адрес редакции:*
ул. Войкова, 21, 225404 г. Барановичи.
Телефон: +375 (163) 45 46 28.
E-mail: vestnik@barsu.by .

*Подписные индексы:* 00993 — для индивидуальных подписчиков; 009932 — для организаций.

Свидетельство о регистрации средств массовой информации № 1533 от 30.07.2012, выданное Министерством информации Республики Беларусь.

*В соответствии с приказом Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 21 января 2015 г. № 16 научно-практический журнал «Вестник БарГУ» серия «Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки» включён в Перечень научных изданий Республики Беларусь для опубликования результатов диссертационных исследований по историческим наукам и археологии, экономическим и юридическим наукам.*

*Научно-практический журнал «Вестник БарГУ» включён в РИНЦ (Российский индекс научного цитирования), лицензионный договор № 06-1/2016.*

*Издатель:* учреждение образования «Барановичский государственный университет».

Выходит на русском, белорусском и английском языках.

Журнал распространяется на территории Республики Беларусь.

---

*Заведующий редакционно-издательской группой* С. А. Березнюк
*Технический редактор* А. Ю. Сидоренко
*Компьютерная вёрстка* С. А. Березнюк
*Корректор* С. А. Березнюк

Подписано в печать 14.12.2017. Формат 60 × 84 $^1/_8$. Бумага офсетная. Печать цифровая. Гарнитура Таймс. Усл. печ. л. 23,00. Уч.-изд. л. 19,20. Тираж 75 экз. Заказ .

Цена свободная.

Полиграфическое исполнение: Гродненское областное унитарное полиграфическое предприятие «Слонимская типография». Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий № 1/203 от 07.03.2014, № 2 от 25.02.2014.

Адрес: ул. Хлюпина, 16, 231800 Слоним, Гродненская обл.

© БарГУ, 2017

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ

### ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Ганский В. А., Калачёва И. И.** Туристические маршруты в Западной Беларуси (1921—1939 годы) . . . . . . . . . . . . . . . . 13
**Жилинский П. А.** Характерные черты и сущность социально-экономического кризиса в Беларуси в начале 1990-х годов . . . . . . . . . . . . . . . . 19
**Корнелюк В. Г.** События вынужденной миграции населения Беларуси, вызванные Первой мировой войной, на страницах книг серии «Память» . . . . . . . . . . . . . . . . 27
**Кручковский Т. Т.** История России первого периода и польско-русские отношения этого периода в интерпретации В. О. Ключевского . . . . . . . . . . . . . . . . 33
**Пискун В. Э.** Политика Польши в отношении ФРГ во второй половине 1980-х годов . . . . . . . . . . . . . . . . 41
**Чуль Р. В.** Политика российского правительства в отношении православной конфессии на территории Беларуси в конце XVIII — начале XX века . . . . . . . . . . . . . . . . 46
**Ярмусик Э. С.** Католический Костёл и проблемы семьи . . . . . . . . . . . . . . . . 51


### ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Биглова Г. Ф., Житкевич Г. Я., Познякевич В. Н.** Феномен волонтерства как социальная инновация и его экономический эффект . . . . . . . . . . . . . . . . 60
**Власюк Ю. А., Ковалевич О. А.** Оценка эффективности туризма в регионе . . . . . . . . . . . . . . . . 65
**Климук В. В.** Наноиндустриальный сектор экономики: инфраструктура, состояние рынка . . . . . . . . . . . . . . . . 70
**Кочурко О. А., Янукович О. В., Диковицкая Д. В.** Перспективы кластеризации региональной экономики . . . . . . . . . . 77
**Кременевская В. Н.** Кластерный подход к устойчивому развитию туристических дестинаций. Перспективы развития туристического кластера «Зеленое кольцо Барановичей» . . . . . . . . . . . . . . . . 82
**Панов А. М.** Качество рабочей силы на рынке труда региона в условиях неустойчивой занятости . . . . . . . . . . . . . . . . 88
**Самосюк Н. А.** Предпосылки перехода на новые методы учета затрат и калькулирования себестоимости в энергетике Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 95
**Толкач А. Г.** Развитие инструментария оценки эффективности административного регулирования предпринимательской деятельности в Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 101
**Трич Ю. А.** Формирование стратегии ресурсосбережения в стекольной промышленности Республики Беларусь . . . . . . 107
**Тымуль Е. И.** Эволюция понятия «риск» и его особенности на предприятиях энергетики . . . . . . . . . . . . . . . . 112
**Цимбаленко С. Н.** Совершенствование финансового механизма предприятий льняного подкомплекса Республики Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 116


### ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Андрияшко М. В.** Пенсионное обеспечение за особые заслуги на территории государств — участников Содружества Независимых Государств . . . . . . . . . . . . . . . . 120
**Бильдейко А. А.** К вопросу о новых критериях оценки эффективности прокурорского надзора в сфере экономики . . . . . . 125
**Василевич Д. Г.** Права и обязанности индивида при смене половой принадлежности . . . . . . . . . . . . . . . . 130
**Вашкевич С. В.** Обеспечение доступа к информации о законотворчестве в Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 136
**Ежова Е. В.** Некоторые особенности апелляционного обжалования решений суда первой инстанции в России и Республике Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 141
**Ефременко Е. М., Березнёв Р. Ю.** Сущность принуждения в гражданском праве . . . . . . . . . . . . . . . . 145
**Заборовский В. В.** Особенности конституционно-правового статуса украинской адвокатуры . . . . . . . . . . . . . . . . 150
**Кострова М. Б.** Некоторые направления совершенствования языковой формы российского уголовного закона с учетом белорусского опыта . . . . . . . . . . . . . . . . 155
**Крутько Р. В.** Наименование религиозных организаций как средство индивидуализации в гражданском обороте . . . . . . . . 160
**Мягкая Е. В.** Ретроспективный анализ правового регулирования подоходного налога в спортивной сфере в современной Беларуси . . . . . . . . . . . . . . . . 165
**Новикова Е. А.** Системность оснований криминализации в уголовном праве . . . . . . . . . . . . . . . . 171
**Пономаренко Ю. А.** Штраф в уголовном праве Республики Беларусь и Украины: общее и особенности, современность и перспективы . . . . . . . . . . . . . . . . 175
**Пузырёв М. С.** Сравнительный анализ исполнения наказания в виде лишения свободы на определенный срок в отношении отдельных категорий осужденных по законодательству Украины и Швейцарии . . . . . . . . . . . . . . . . 179


Репозиторий БарГУ

# *ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ И АРХЕОЛОГИЯ*

# *HISTORICAL SCIENCES AND ARCHAEOLOGY*

УДК 94(438)“1921/1939”:379.85

**У. А. Ганскі[1], І. І. Калачова[2]**
[1] Львоўскі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт, Цэнтральны саюз спажывецкіх таварыстваў Украіны, вул. Туган-Бараноўскага, 10, 79005 Львоў, Украіна, +380 (50) 569 86 34, ganski@i.ua
[2] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, пр-т Незалежнасці, 4, 220030 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (17) 259 70 60, conference.belarus@gmail.com

## ТУРЫСТЫЧНЫЯ МАРШРУТЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921—1939 ГАДЫ)

Упершыню апісваюцца турыстычныя маршруты, якія былі распрацаваны і дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі. Прыводзіцца агульная колькасць турыстычных маршрутаў у разрэзе адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы і тыпаў транспарту (воднага, чыгуначнага, аўтамабільнага), які можа выкарыстоўвацца ў турызме, а таксама пешых турыстычных маршрутаў. Характарызуюцца турыстычныя маршруты асноўных макрарэгіенаў Заходняй Беларусі — Віленшчыны, Палесся і Панямоння. Даецца характарыстыка найбольш папулярных сярод мясцовага насельніцтва і прыезджых турыстычных маршрутаў Заходняй Беларусі з указаннем уключаных у іх аб’ектаў турыстычнай атракцыі (памятных мясцін, помнікаў прыроды, гісторыі і культуры, рэкрэацыйных аб’ектаў і зон і інш.). Падаецца спецыфіка перасоўвання турыстаў па маршрутах, наяўнасць на маршрутах аб’ектаў турыстычнай інфраструктуры і інш.

**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь; турызм; гісторыя турызму; турыстычныя маршруты; водны турызм; турыстычныя рэгіёны.
Табл. 1. Бібліягр.: 9 назваў.

**U. A. Ganski[1], I. I. Kalachova[2]**
[1] Lviv University of Trade and Economics, Central Union of Consumer Associations of Ukraine, 10 Tugan-Baranovskiy Str., 79008 Lviv, Ukraine, +380 (50) 569 86 34, ganski@i.ua
[2] Belarusian State University, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 4 Nezalezhnastsi ave., 220030 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (17) 259 70 60, conference.belarus@gmail.com

## TOURIST ROUTES IN WESTERN BELARUS (1921—1939)

The article describes the tourist routes which were developed and operated in Western Belarus in the period between the first and the second World Wars. It is reported about the total number of tourist routes in the context of administrative and territorial division of Western Belarus as part of Poland, the means of transport (water, railway, automobile) used in tourism, and the walking tourist routes. The tourist routes of the main macro regions in Western Belarus, such as Vilnya, Palesse and Panyamonne ones, are characterized. The most popular among the local population and strangers tourist sights are described (memorable places; monuments of nature, history and culture; recreational properties and zones; etc.). It allocates the specificity of tourists’ travelling, determines availability of touristic infrastructure, etc.

**Key words:** Western Belarus; tourism; history of tourism; tourist routes; water tourism; tourist regions.
Table 1. Ref.: 9 titles.

**Уводзіны.** Міжваенны перыяд у гісторыі развіцця турызму ў Беларусі мае асаблівае значэнне, бо менавіта тады пачалося яго станаўленне на беларускіх землях у сучасным навуковым разуменні гэтага тэрміна. Упершыню распрацоўваецца вялікая колькасць разнастайных турыстычных маршрутаў, заснаваных на наяўных на тэрыторыі Заходняй Беларусі турыстычных рэсурсах — рэках і азёрах, помніках гісторыі і культуры, запаведных лясах і інш. Удзел у іх распрацоўцы прымалі Таварыства развіцця ўсходніх зямель, Віленскае таварыства сяброў навук, Гродзенскае таварыства сяброў навук, мясцовыя падраздзяленні Польскага краязнаўчага таварыства і іншыя грамадскія арганізацыі, а таксама ваяводскія турыстычныя камісіі, рэферэнты па пытаннях турызму, бюро падарожжаў і інш. [1, с. 3—8]. Вялікая іх частка была зацверджана на дзяржаўным узроўні, і інфармацыя пра іх уключалася ў турыстычныя даведнікі, якія выдаваліся на асноўных еўрапейскіх мовах.

© Ганскі У. А., Калачова І. І., 2017



Рэпазітарый БарГУ

**Метадалогія і метады даследавання.** Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца даследаванне сеткі рознапланавых турыстычных маршрутаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гадах. Дадзеная тэма да цяперашняга часупрактычна не ўздымалася ні ў айчыннай, ні ў замежнай гістарыяграфіі. Асобныя існуючыя публікацыі па праблемах развіцця турызму ў міжваенны перыяд або не характарызавалі ў належнай меры ўсю сукупнасць турыстычных маршрутаў Заходняй Беларусі, або іх геаграфічныя рамкі не ўключалі (або ўключалі часткова) тэрыторыю Заходняй Беларусі, факусуючыся на іншых сумежных рэгіёнах — Валыні, Галіцыі, Мазурах, Мазовіі і інш. Пры падрыхтоўцы артыкула былі выкарыстаны матэрыялы беларускіх і замежных архіўных устаноў: дзяржаўных архіваў у Брэсце, Гродне і Маладзечне, а таксама Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва ў Вільнюсе, дзе захоўваюцца матэрыялы справаводства ваяводскіх турыстычных камісій, розныя даведачныя і інфармацыйныя матэрыялы па тэме даследавання.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Да сярэдзіны 1930-х гадоў у Заходняй Беларусі было распрацавана больш за 200 турыстычных маршрутаў (табліца 1): пешаходных, аўтамабільных і водных, якія групаваліся па чатырох турыстычных рэгіёнах, прыкладна адпавядаўшым адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу: Віленшчына, Палессе, Гарадзеншчына, Навагрудчына. Апошнія два часта разглядаліся як адзін турыстычны макрарэгіён «Панямонне», бо значная колькасць сухапутных і водных маршрутаў пралягалі адначасова па тэрыторыі абодвух гэтых ваяводстваў.

Т а б л і ц а 1. — Колькасць турыстычных маршрутаў у Заходняй Беларусі па ваяводствах ў 1935 годзе

| Ваяводства | Сухапутныя | | Водныя | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| | пешаходныя | аўтамабільныя | маламерныя | матарызаваныя | |
| Віленскае | 31 | 23 | 27 | 9 | 90 |
| Беластоцкае | 21 | 15 | 14 | 7 | 57 |
| Навагрудскае | 17 | 13 | 9 | 5 | 44 |
| Палескае | 22 | 11 | 19 | 14 | 66 |
| Разам | 91 | 62 | 69 | 35 | 247 |

*Заўвага.* Складзена аўтарамі на аснове архіўных дадзеных [2, л. 2—9].

Горадам, які валодаў найбольшай турыстычнай прывабнасцю ў заходнебеларускім рэгіёне, была Вільня. Турыстаў прываблівала туды багатая гісторыка-культурная спадчына. Найбольш наведвальнымі аб’ектамі ў ім былі шматлікія помнікі культавай архітэктуры, Віленскі ўніверсітэт, рэшткі замка, ратуша, музеі, месцы жыцця выбітных дзеячаў навукі, культуры і мастацтва, а таксама кірмашы і культурна-масавыя ўстановы і мерапрыемствы.

З Вільні прапаноўваліся рэгулярныя паездкі ў бліжэйшыя прыгарады: Трынапаль, Кальварыю і Вяркі. У летні час вялікай папулярнасцю карысталіся рачныя параходныя экскурсіі: у буднія дні параход адпраўляўся чатыры разы на дзень, у святочныя — кожную гадзіну. Працягласць паездкі складала каля 1 гадзіны туды і каля 30 хвілін у зваротным кірунку [3, с. 39—41]. Уздоўж маршруту на рацэ было арганізавана мноства платных і бясплатных пляжаў. Ад Вяркоў адпачывальнікі маглі дабрацца да маляўнічых Зялёных Азёр фурманкай або ўзяць напракат лодку. Сярод адпачывальнікаў таксама быў папулярны маршрут з Вільні ў Панары, Ландвараў і Трокі. Аўтобусы туды адпраўляліся 10 разоў на дзень і нават часцей. На гэтым маршруце турыстаў вабілі маляўнічыя ўзгорыстыя пейзажы ваколіц Вільні, а таксама гістарычныя помнікі і асабліва — руіны сярэднявечных замкаў.

Выезд для адпачынку ў бліжэйшыя прыгарады ў летні час у 1920—1930-я гады быў надзвычай папулярны сярод жыхароў Вільні. У населеных пунктах, размешчаных на адлегласці ад 5 да 30 км ад горада, сталі ўзнікаць цэлыя пасёлкі з летніх катэджаў, прызначаных для здачы ў арэнду адпачывальнікам. На першую палову 1930-х гадоў прыпадае бум катэджнага будаўніцтва. Самымі папулярнымі напрамкамі для летняга адпачынку былі Вяркі, Трокі, Нававілейка, Замэчак, Немянчын,

Рэпазіторый БарГУ

Ландвараў, Жэша — Пікелішкі — Падбярэззе, Мейшагола, Судэрва — Дукшты Піярскія, Алькенікі, Тургелі, Дзевянішкі [3, с. 31—39].

Асновай для фарміравання сеткі турыстычных маршрутаў Віленшчыны стала чыгунка, якая забяспечвала зручную камунікацыю як з адміністрацыйным цэнтрам рэгіёна, так і са сталіцай і іншымі буйнымі гарадамі, якія з'яўляліся месцамі фарміравання турыстычнага попыту і турыстычных патокаў, якія накіроўваліся ў гэты рэгіён. Уздоўж чыгуначнай лініі з Варшавы і Беластока быў распрацаваны турыстычны маршрут «Араны — Вільня — Турмонт» [3, с. 47—53]. Для кожнай станцыі, размешчанай на гэтай лініі, прапаноўваўся пакет экскурсій для наведвання памятных месцаў, размешчаных не далей за 5 км ад станцыі.

Своеасаблівым працягам дадзенага маршруту была галіна вузкакалейнай чыгункі Дукшты — Друя, якая дазваляла турыстам за 4-5 гадзін дабрацца з Вільні да Браслаўскіх азёр і Браслава — турыстычнага рэгіёна з развітай турыстычнай інфраструктурай: гатэлямі, шматлікімі школьнымі і моладзевымі лагерамі і інш. Турыстычныя маршруты Браслаўскага рэгіёна былі распрацаваны такім чынам, каб спалучаць адпачынак на прыродзе з наведваннем цікавых мясцін. Месцам адпраўлення ўсіх маршрутаў быў Браслаў як найбольш зручнае месца камунікацыі прадстаўнікоў праўлення мясцовага аддзела Польскага краязнаўчага таварыства з турыстамі. Пешых турыстычных маршрутаў было распрацавана чатыры: на поўнач ад Браслава ў напрамку возера Снуды; у заходнім напрамку ў бок Опсы; ва ўсходнім кірунку на Міёры і Лявонпаль; на возера Дрысвяты з начлегам. У Браслаўскім павеце турыстам прапаноўваліся і водныя маршруты. Самы папулярны пачынаўся ў Дукштах і пралягаў азёрамі Дзісна і Дзіснішча, ракой Дзісной да вёскі Каз'яны, адкуль ішоў на Дрысвяты праз возера Багінскае, далей па рацэ Дрысвяціцы да возера Дрысвяты. Акрамя таго, гасцям Браслава прапаноўваліся і тры аўтамабільныя маршруты па тэрыторыі павета.

Да мястэчка Друя на мяжы з Латвіяй можна было дабрацца з Вільні і па іншай чыгунцы праз Варапаева, Круляўшчызну і Міёры, дзе турыстам сярод іншага прапаноўваліся да агляду шматлікія помнікі драўлянай архітэктуры XVIII стагоддзя, шляхецкія сядзібы і храмы. Скарыстаўшыся гэтым маршрутам, турысты мелі магчымасць таксама пазнаёміцца з выдатнымі мясцінамі Паставаў, адкуль можна было, арандаваўшы транспарт (у тым ліку аўтобус на 18 месцаў, які належаў рэстарану «Гаспода польска»), накіравацца на возера Нарач. Таксама менавіта да гэтага перыяду адносіцца ўсплеск турыстычнай цікавасці да вёскі Мосар (сучасны Глыбоцкі раён) — былога маёнтка Бжастоўскіх і Пілсудзкіх, дзе турыстаў вабілі паўразбураны палац і касцёл св. Ганны XVIII стагоддзя. Начлег турыстам прапаноўваўся ў горадзе Глыбокае, дзе меліся дзве гасцініцы («Варшаўская» і «Камерцыйная»), казіно, установы грамадскага харчавання, а таксама шматлікія помнікі сакральнай архітэктуры [4, л. 3—5].

Яшчэ адным турыстычным напрамкам у бок савецкай мяжы, які рэкамендавалі даведнікі 1920—1930-х гадоў, была чыгуначная лінія з Вільні ў бок Мінска да станцыі Аляхновічы, дзе турыстам прапаноўвалася наведаць Кену, Гудагай, Смаргонь, Залессе і ваколіцы. Аўтары маршруту прапаноўвалі турыстам наведаць палацава-паркавы комплекс у маёнтку Шумск, замкавыя руіны ў Медніках, касцёлы ў Кене і Астраўцы. Начлег турысты маглі атрымаць у Смаргоні, дзе меліся гасцініцы «Брыстоль» і «Еўропа», установы грамадскага харчавання, а таксама розныя помнікі архітэктуры. Аднак галоўнай турыстычнай славутасцю гэтага маршруту было Залессе і размешчаная там сядзіба М. К. Агінскага, у якой для агляду на той момант былі даступныя толькі флігель, аранжарэя, капліца і паркавыя алеі з двумя памятнымі камянямі. Нягледзячы на гэта, паток турыстаў у Залессе на працягу ўсяго міжваеннага перыяду толькі ўзрастаў.

Папулярнасцю карыстаўся і аўтамабільны турыстычны маршрут з Вільні ў Валожын праз Ашмяны і Гальшаны, які пры неабходнасці мог быць падоўжаны да Івянца і Сталбцоў. Добрая аўтобусная камунікацыя па маршруце дазваляла турыстам абысціся без уласнага аўтамабіля. Паездка з Вільні магла працягвацца як адзін дзень (толькі да Ашмян), так і 2 і больш дзён па жаданні турыстаў, якія з любой кропкі маршруту свабодна маглі вярнуцца назад у Вільню. Пры наяўнасці часу турысты маглі наведаць Крэва ці Налібоцкую пушчу.

У цёплы час асаблівай папулярнасцю сярод жыхароў Вільні і гасцей рэгіёна карысталіся паездкі да азёр Нарачанскай групы па маршруце Вільня — Кабыльнік — Мядзел. Аўтамабільная дарога на ўсім працягу з Вільні мела цвёрдае пакрыццё, па якой даволі часта курсіравалі аўтобусы ў Мядзел і да базы адпачынку на возеры Нарач. Дарога аўтобусам з Вільні займала каля 6 гадзін. У 1937 годзе ў курортным

Рэпазіторый БарДУ

пасёлку Нарач была адкрыта станцыя вузкакалейнай чыгункі, якая забяспечыла прамую камунікацыю з Вільняй праз Лынтупы і надала новы імпульс развіццю турызму ў нарачанскім краі.

Самым усходнім турыстычным маршрутам ва ўсёй міжваеннай Польшчы быў маршрут з Глыбокага ў Дзісну. Маршрут быў сухапутны, працягласцю каля 75 км. Турысты таксама наведвалі Лужкі і Германавічы, дзе маглі агледзець касцёл і кляштар піяраў 1756 года і касцёл Праабражэння Гасподняга 1787 года.

Вялікая колькасць цікавых і памятных месцаў было даступна для агляду турыстам, якія вандравалі па маршруце Ваўкавыск — Слонім — Баранавічы — Стаўбцы. Развітая чыгуначная камунікацыя з Беластокам і Варшавай, блізкасць аб'ектаў турыстычнага паказу да транспартных артэрый, адносная развітасць турыстычнай інфраструктуры забяспечвалі стабільны прыток турыстаў у рэгіён. Праезд чыгункай з Варшавы ў Баранавічы займаў каля 12 гадзін, ад Ваўкавыска да Стоўбцаў — ад 3 да 7 гадзін. У раскладзе меліся як дзённыя, так і начныя цягнікі з вагонамі ўсіх тыпаў, уключаючы спальныя.

Арганізацыяй прыёму турыстаў у Слоніме і ваколіцах займалася мясцовае аддзяленне Польскага краязнаўчага таварыства. Са Слоніма турысты, спыніўшыся ў гатэлях «Вікторыя», «Кракаўскі», «Гранд-гатэль» ці «Славянскі», аўтобусамі маглі трапіць у Навагрудак, Ружаны, Наваельню і Дзятлава. Даведнікі рэкамендавалі турыстам агледзець у Слоніме касцёл св. Тройцы 1645 года, сінагогу XVII стагоддзя, бернардынскі касцёл і кляштар 1664—1670 гадоў, касцёл Божага цела 1650 гадоў, а таксама касцёл св. Андрэя [3, с. 84—91].

Праехаўшы аўтобусам са Слоніма 10 км, турысты мелі магчымасць наведаць храм-крэпасць у Сынкавічах, дзе прыём гасцей забяспечваў уласнік маёнтка Сынкавічы Ю. Гадлеўскі, актыўны член Саюза турыстычнай прапаганды, які пры неабходнасці даваў турыстам начлег. Акрамя таго, праехаўшы 9 км са Слоніма, турысты маглі пазнаёміцца з Жыровічамі і размешчанымі там святынямі, а таксама сядзібай Пуслоўскіх «Альбярцін» XIX стагоддзя.

З'яўляючыся важным транспартным вузлом, Баранавічы былі цікавыя турыстам перадусім як месца перасадкі або начлегу: у горадзе меліся гатэлі «Еўропа», «Брыстоль», «Віленскі», мэбляваныя пакоі і апартаменты, рэстараны, кафэ, кінатэатры і інш. [3, с. 80-81]. Каардынацыю турыстычнага руху ажыццяўлялі аддзяленне Польскага краязнаўчага таварыства і секцыя турызму і прапаганды гарадской адміністрацыі. Скарыстаўшыся аўтобусамі, з Баранавічаў турысты маглі агледзець славутасці ваколіц у Сталовічах, Гарадзішчы і Завоссі.

У міжваенны час папулярнасцю сярод турыстаў (у асноўным, моладзі і школьнікаў) карыстаўся «Міцкевічаўскі маршрут»: з Баранавічаў праз Завоссе да Навагрудка агульнай працягласцю амаль 100 км. Маршрут мог быць як пешаходным, так і аўтобусным, займаць ад некалькіх дзён да тыдня. Асноўнымі турыстычнымі аб'ектамі на маршруце былі: Завоссе (месца нараджэння А. Міцкевіча), Туганавічы (сядзіба, дзе гасцявалі А. Міцкевіч, Я. Чачот, Т. Зан, І. Дамейка і дзе адбылося знаёмства А. Міцкевіча з М. Верашчакай, камень філарэтаў), Варонча (касцёл св. Ганны, дзе хрысцілі Я. Чачота), возера Свіцязь, Валеўка (радзіма маці А. Міцкевіча), Навагрудак (дом-музей паэта, курган Неўміручасці, фарны касцёл — месца хрышчэння А. Міцкевіча, замак, касцёл св. Міхаіла і манастыр, у школе якога вучыліся У. Сыракомля, А. Міцкевіч, Я. Чачот), Шчорсы (палацава-паркавы комплекс Храптовічаў). Маршрут функцыянаваў у летні час і актыўна прапагандаваўся ўладамі, бо валодаў важным ідэалагічным зместам. На возеры Свіцязь дзейнічала турбаза Польскага краязнаўчага таварыства на 40 месцаў [5, л. 2—6].

Турысты, якія жадалі наведаць славутасці Міра і Нясвіжа, выходзілі на чыгуначнай станцыі Гарадзея, адкуль аўтобусамі можна было дабрацца да Нясвіжа за 1 злоты і 50 грошаў. Аўтобусы ў Нясвіж курсіравалі ўвесь год, на Клецк — толькі ў летні час. У Гарадзеі турыстам былі даступныя гатэлі («Варшаўскі», «Брыстоль», «Еўропа»), апартаменты (М. Анішчук), рэстаран, кафэ і банкі [3, с. 102—103]. З Нясвіжа пры ўмове атрымання пропуску можна было праехаць да польска-савецкай мяжы, наведаць збудаванні на мяжы, а таксама азнаёміцца з працай Корпуса аховы памежжа.

У Стоўбцах, дзе тады канчалася вузкая еўрапейская чыгуначная каляіна, можна было перасесці на аўтобусы Стоўбцы — Навагрудак праз Мір, Турэц, Стоўбцы — Івянец праз Рубяжэвічы і Стоўбцы — Гарадзея праз Мір. Аўтобусы курсіравалі выключна ў летні час. Таксама ў Стоўбцах дзейнічалі тры гатэлі, рэстараны, кафэ, банкі, кінатэатры і бюро падарожжаў.

Важнай транспартнай артэрыяй, перасякаўшай з поўначы на поўдзень тэрыторыю Заходняй Беларусі, славутасці ўздоўж якой былі апісаны ў многіх міжваенных даведніках, была чыгуначная лінія Ліда — Баранавічы — Лунінец, якая злучала Вільню і Львоў. Ад яе ў Наваельні адгаліноўвалася лінія



Репозиторий БарГУ

вузкакалейнай чыгункі на Любчу праз Навагрудак, дзе аб'ектамі паказу былі руіны замка, курган Міцкевіча, гара Міндоўга, дом А. Міцкевіча, касцёлы і інш. У горадзе меліся чатыры гатэлі і аб'екты грамадскага харчавання.

З Навагрудка прапаноўваліся і загарадныя экскурсіі па ваколіцах. Турыстычны маршрут «Нясвіжскім трактам», або так званай напалеонаўскай дарогай, пралягаў да вёскі Ваўковічы ў 9 км ад горада. Далей па гэтай жа дарозе можна было трапіць у Карэлічы і Мір. З любой кропкі маршруту можна было лёгка вярнуцца назад у Навагрудак аўтобусам, даехаць да чыгуначнай станцыі ў Гарадзеі ці да Нясвіжа. З Навагрудка таксама прапаноўваліся паездкі аўтобусам у Любчу коштам 2 злотыя 50 грошаў у абодва бакі [3, с. 101].

Важным горадам Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд была Гародня, размешчаная на чыгуначнай лініі з Варшавы ў Вільню. Яна мела прамую аўтобусную камунікацыю з Вільняй, Ваўкавыскам, Беластокам, Аўгустовам, Друскенікамі і іншымі месцамі, а таксама рачную камунікацыю з Лунна і Мастамі. План горада з нанесенымі на яго асноўнымі славутасцямі быў размешчаны ў будынку чыгуначнага вакзала. У горад турыстаў прыцягвалі шматлікія помнікі архітэктуры, месцы, звязаныя з жыццём вядомых асоб (Э. Ажэшка, С. Баторый, А. Тызенгауз, С. А. Панятоўскі і інш.), гістарычнымі падзеямі і г. д. У горадзе меліся гатэлі, апартаменты, мэбляваныя пакоі, рэстараны, кафэ і іншыя неабходныя аб'екты інфраструктуры.

У гарадзенскі рэгіён турыстаў вабілі таксама і рэкрэацыйныя магчымасці курорта ў Друскеніках. На кароткай лініі Друскенікі — Парэчча была арганізавана зручная чыгуначная камунікацыя, якая забяспечвала стыкоўкі з усімі цягнікамі ў кірунку як Вільні, так і Гародні, Беластока і Варшавы. У будынку вакзала ў Друскеніках дзейнічаў турысцка-інфармацыйны пункт. З Друскенік для адпачывальнікаў арганізоўваліся экскурсіі: у даліну Нёмана і да лясных азёр, па ваколіцах. Акрамя пешаходных і веласіпедных, праводзіліся і водныя экскурсіі па Нёмане і Аўгустоўскім канале. Прыём турыстаў і абслугоўванне экскурсій забяспечвала Таварыства сяброў Друскенік.

Нёман, галоўная водная артэрыя Гродзеншчыны, у 1920—1930-я гады актыўна асвойваўся аматарамі водных відаў спорту. Сплавы па Нёмане практыкаваліся паўсюдна аж да самай літоўскай мяжы. Аднак на Гарадзеншчыне на берагі Нёмана накіроўваліся не толькі аматары актыўнага адпачынку, але і экскурсанты, якія жадалі наведаць мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Э. Ажэшка [6, л. 2]. Турысты з Гародні аўтамабільным ці рачным транспартам дабіраліся да Багатыровічаў, дзе была параходная прыстань, і далей у суседнюю Мількоўшчыну. Там пісьменніца праводзіла лета і апісала мясцовыя краявіды ў сваіх творах.

Своеасаблівым турыстычным рэгіёнам было Палессе. Аднайменнае ваяводства, з'яўляючыся адным з найбуйнейшых у міжваеннай Польшчы, у той жа час валодала мінімальнай сеткай чыгункі (усяго 770 км і каля 200 км вузкакалейкі) [7, л. 2—5], нязначнай працягласцю аўтамабільных дарог. Гэта рабіла рэгіён цяжкадаступным для масавага наведвання турыстамі, але пакідала магчымасці для развіцця воднага турызму. Самым распаўсюджаным сродкам турыстычнай камунікацыі на Палессі была байдарка або каяк. Практычна ўсе цікавыя аб'екты і населеныя пункты можна было наведаць, падарожнічаючы воднымі маршрутамі. Адзіным маршрутам, на якім існавала магчымасць азнаямлення з рэгіёнам на аўтамабілі, была траса Брэст — Кобрын — Бяроза — Івацэвічы і далей да мяжы.

Эканамічным і культурным цэнтрам Палесся быў Пінск. У горадзе меліся больш двух дзясяткаў аб'ектаў часовага размяшчэння: гатэляў, мэбляваных пакояў, апартаментаў і інш. Размяшчэнне на школьнай турбазе колькасцю 40 ложка-месцаў трэба было рэзерваваць за два тыдні. У горадзе можна было арандаваць веласіпеды і шматлікія лодкі [8, л. 2—3]. Для агляду мясцовых славутасцяў паслугі экскурсаводаў аказвалі чыноўнік магістрата Б. Варановіч і настаўнік гімназіі Ю. Абухоўскі.

У адміністрацыйным цэнтры рэгіёна, Брэсце, галоўнай турыстычнай славутасцю была крэпасць, хоць яе наведванне тады і не насіла масавага характару. Для наведвання крэпасці неабходна было прад'явіць пасведчанне асобы і атрымаць спецыяльны пропуск, бо ў той час крэпасць з'яўлялася месцам размяшчэння ваенных устаноў. Якога-небудзь экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў у крэпасці прадугледжана не было. Сярод загарадных экскурсій з Брэста папулярнасцю карыстаўся маршрут у в. Скокі — месца нараджэння і пражывання пісьменніка, гісторыка і грамадскага дзеяча Ю. Урсын-Нямцэвіча. Наведвальнікі мелі магчымасць агледзець фамільны маёнтак з палацава-паркавым комплексам і капліцай [9, л. 29].

У ваколіцах Маларыты ў летні час адпачывальнікі накіроўваліся ў в. Олкуш і в. Арэхава, дзе знаходзіліся маляўнічыя азёры. Адпачывальнікам у наём прапаноўваліся летнія домікі і іншы начлег, мелася пошта, лекар і інш. Мясцовыя азёры лічыліся самым рыбным месцам на ўсім Палессі.

Рэпазіторый БарДУ

З Олкуша і Арэхава турысты маглі лёгка дабрацца і да іншых азёр Шацкай групы. Яшчэ адным папулярным напрамкам адпачынку было наведванне азёр Спораўскага, Чорнага і Белага. Турысты прыбывалі на чыгуначную станцыю ў Бярозе Картузскай, а далей на веласіпедах або фурманкай ехалі да азёр. На Чорным возеры дзейнічаў школьны лагер на некалькі дзясяткаў месцаў, які прымаў таксама і іншых турыстаў. На Белым возеры турысты маглі агледзець шматлікую калонію баброў.

Адным з самых наведвальных турыстычных маршрутаў Палесся ў 1920—1930-я гады быў маршрут па мясцінах, звязаных з жыццём Т. Касцюшкі, — у Косава і Мерачоўшчыну. Ён актыўна прапагандаваўся Польскім краязнаўчым таварыствам, Саюзам польскіх настаўнікаў, харцарскімі і іншымі арганізацыямі, што знаходзіла падтрымку ў кіруючых колах дзяржавы. Тэматыку нацыянальна-вызваленчых паўстанняў раскрывалі і экскурсіі ў ваколіцах Кобрына: у в. Крупчыцы, дзе адбылася бітва генерала К. Серакоўскага з войскамі А. Суворава; у Савіцкі лес, дзе Р. Траўгут прыняў у бой на чале 200 паўстанцаў, а таксама ў Астроўе, дзе знаходзілася капліца, у якой паўстанцы пад кіраўніцтвам Р. Траўгута атрымалі добраслаўленне на пачатак баявых дзеянняў. Дабрацца да гэтых месцаў турысты маглі з Кобрына аўтобусамі або скарыстаўшыся паслугамі прыватных перавозчыкаў.

**Заключэнне.** У 1920—1930-я гады ў Заходняй Беларусі была распрацавана вялікая колькасць турыстычных маршрутаў як для пешых паходаў, так і для паездак аўтамабільным, чыгуначным або водным транспартам. Яны былі досыць разнастайнымі па тэматыцы і маглі задаволіць самыя розныя турыстычныя запыты: агляд гістарычных помнікаў, наведванне месцаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю выбітных ураджэнцаў рэгіёна, спакойны адпачынак на берагах шматлікіх вадаёмаў, а таксама сплавы па вялікіх і малых рэках рэгіёна або паездкі па ім на рачным транспарце. Разнастайнасць турыстычнай прапановы, добрая транспартная даступнасць і невысокія кошты вызначылі рост папулярнасці адпачынку ў Заходняй Беларусі і прыток турыстаў у рэгіён у 1930-я гады.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Ганскі, У. А.* Дзейнасць грамадскіх арганізацый і таварыстваў у галіне падарожжаў і турызму ў Заходняй Беларусі / У. А. Ганскі // Весн. Палес. дзярж. ун-та. Сер. грамад. і гуманітар. навук. — 2014. — № 1. — С. 3—8.
2. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў. — Ф. 51. — Воп. 10. — Спр. 28.
3. Przewodnik po Polsce : w 4 t. / pod red. S. Lenartowicza. — Warszawa : Sp. Akc. «Nasza księgarnia», 1935. — T. 4. Polska Północno-Wschodnia / S. Osiecki [i inne]. — 362 s.
4. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. — Ф. 4. — Воп. 1. — Спр. 571.
5. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. — Ф. 551. — Воп. 1. — Спр. 1983.
6. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. — Ф. 46. — Воп. 1. — Спр. 6.
7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 1. — Воп. 5. — Спр. 876.
8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 1. — Воп. 4. — Спр. 1763.
9. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 1. — Воп. 1. — Спр. 891.

Паступіў у рэдакцыю 14.07.2017

Репозиторий БарГУ